якіх у камп'ютэр уводзіцца і апрацоўваецца любая мелодыя.

У педагагічнай рабоце з ансамблем духавых інструментаў прымяненне камп'ютэра, «караля» тэхнічных сродкаў, дае вельмі якасныя і хуткасныя вынікі. Усе асноўныя этапы работы з духавым ансамблем магчыма, і нават неабходна, забяспечваць з дапамогай камп'ютэра. Назавем некаторыя з іх.

1) З камп'ютэрам вельмі добра праслухоўваецца і праглядаецца на маніторы сінхроннасць рытмічнай пульсацыі.

2) Лёгка выяўляецца галоўная партыя выконваемага твора.

3) Кантралюецца пераход мелодыі ад аднаго інструмента да другога.

4) Балансуецца дынаміка гучання кожнай партыі паасобку і ўсяго ансамбля ў цэлым.

5) Маюцца шырокія магчымасці кампазіцыйнай пабудовы музычнай фразы.

6) Удакладняюцца штрыхі выконваемага твора, узровень вібрацыі і якасць гучання.

7) Есць магчымасць сумяшчэння камп'ютэрнага гучання партый адных галасоў ансамбля з жывым гучаннем другіх.

8) На заключным этапе работы з дапамогай камп'ютэра магчыма якасна працаваць над фразіроўкай, фактурай, стылем, вобразнасцю і формай музычнага твора.

Адной з галоўных праблем пры ігры на духавых інструментах з'яўляецца інтанацыя, і камп'ютэр тут найлепшы дарадца і памочнік. Перш-наперш неабходна ўвесці ў «памяць» камп'ютэра інтанацыйнае ўпарадкаванне ступеняў таго ладу, у якім будзе выконвацца музычны твор. Падстройка ступеняў залежыць ад выконваемага твора і ад складу ансамбля (аднародныя інструменты ці змешаныя, з суправаджэннем ці без суправаджэння). У час выканання ансамблем музычнага твора камп'ютэр будзе кантраляваць дакладнасць інтанацыі, аб чым сведчыць светавы індыкатар.

Калі ж уся п'еса прайграна, па жаданню аператара камп'ютэр дасць фанаграму твора ў тым гучанні, у якім ён быў выкананы альбо ў якім павінен гучаць з улікам падстроеных ступеняў ладу. Праслухаўшы абедзве фанаграмы, кіраўніку ансамбля і яго ўдзельнікам адразу будзе зразумела, дзе і над чым патрэбна ў гэтай п'есе папрацаваць.

Такім чынам, з тэхнічных сродкаў, якія магчыма прымяняць пры рабоце з духавым ансамблем, першынство належыць музычнаму камп'ютэру. Другое ж месца пасля камп'ютэра трэба адвесці студыйнаму шматдарожнаму магнітафону, напрыклад сямідарожнаму магнітафону фірмы «PLESSEU-550».

Карыстаючыся гэтым магнітафонам, кіраўнік ансамбля мае таксама вельмі шырокія тэхнічныя магчымасці для ўдасканалення вынікаў работы. Падчас агульнага гучання можна запісаць кожную партыю паасобку. Можна выправіць недакладнасці з інтанаваннем, штрыхамі і дынамікай, пракантраляваць усю п'есу ў кампазіцыйнай пабудове, пачынаючы з простай музычнай фразы. І, нарэшце, ёсць магчымасць прааналізаваць музычны вобраз твора, яго форму і фактуру.

На трэцяе месца сярод тэхнічных сродкаў патрэбна паставіць звычайны малагабарытны пераносны двухкасетны магнітафон. Тэхнічныя магчымасці гэтага магнітафона дазваляюць удзельнікам ансамбля прапрацаваць хоць і не адказныя, але ж даволі значныя моманты ў сваей рабоце. Рытмічнасць, выяўленне галоўнай партыі, пераходы мелодыі ад аднаго інструмента да другога, балансіроўка дынамікі, удакладненне штрыхоў, вібрата, якасць тэмбравага гучання ў рэгістрах, стыль, вобразнасць - усе гэта магчыма пракантраляваць, працуючы з малым магнітафонам.

Бяляева В.М.,
ст.выкладчык

## СТРУКТУРНА-АРГАНІЗУЮЧАЯ АСНОВА МУЗЫКІ І ЯЕ РОЛЯ Ў ФАРМІРАВАННІ ХАРЭАГРАФІЧНАГА ВОБРАЗА

З катэгорый часу ў музыцы найбольшае значэнне пры фарміраванні танцавальнага вобраза мае тэмп. Як вядома, тэмпам у музыцы называецца хуткасць выканання твора (дакладней, частата пульсавання метрычных долей). Як мастацка-сэнсавая характарыстыка, тэмп уздзейнічае на эмацыянальнае ўспрыманне музычнай думкі і паказваецца ў пачатку твора над нотным радком. Назваў музычнага тэмпу даволі многа. Найбольш распаўсюджаныя з іх: adagio (адажыо) - павольна, andante (андантэ) - павольна, allegro (алегра) - хутка, maderato (мадэрата) - умерана, largo (ляргa) - працяжна, grave (гравэ) - цяжка і інш.

У танцавальным творы тэмп таксама з'яўляецца адным з рашаючых фактараў фарміравання пластычнага вобраза, таму што характару кожнага сцэнічнага вобраза адпавядае больш ці менш акрэсленая хуткасць руху. Якое-небудзь значнае адступленне ад тэмпу музычнага твора вядзе да скажэння пластычнага вобраза, наносіць шкоду ўсей кампазіцыі ў цэлым. У музыцы для большай выразнасці мелодыі выкарыстоўваюцца дынамічныя адценні (нюансы). Найбольш распаўсюджанымі з іх з'яўляюцца forte (фортэ) - гучна, piano - (піяна) - ціха, а таксама crescendo (крэшчэнда) - узмацніць, diminuendo (дымінуэнда) - аслабіць. Музычна-дынамічныя адценні вельмі важныя ў перадачы выразнасці танцавальнага вобраза.

Характэрнымі для іх рысамі з'яўляюцца: змена сілы гучання; паступовае паскарэнне ці запаволенне тэмпу; плаўнасць або перарывістасць выканання танцавальнага руху.

Вялікім, але не абсалютным значэннем для харэаграфічнага вобраза з'яўляецца метр. Метрам у музыцы называецца паслядоўнасць акцэнтаваных і неакцэнтаваных адрэзкаў часу, якія паслядоўна паўтараюцца. Метр выкарыстоўваецца для арганізацыі музычных гукаў праз іх розныя акцэнтаванасці. Метр у танцавальным мастацтве таксама, як і тэмп, у значнай ступені вызначае характар пластычнага голасу, дае аснову яго рытмічнай арганізацыі. Аднак пластычная «мова» сцэнічнага вобраза ў рэдкіх выпадках зводзіцца толькі да адбівання кожнай метрычнай долі такта. Звычайна арганізацыя танцавальнага руху больш свабодная: можа супадаць з музычным метрам, але можа і драбіцца, і ўзбуйняцца.

Адыгрываючы ў танцы ролю, хутчэй арганізуючую, чым змястоўную, музычны рытм аказвае яшчэ больш значнае ўздзеянне на танцавальны вобраз. Рытмам (грэч. chythmos - суразмернасць, стройнасць) у музыцы называецца арганізаваная паслядоўнасць гукаў аднолькавай ці рознай працяглисці. У танцавальным мастацтве рытм - гэта найбольш свабодна вар'іруемая характарыстыка танцавальнага вобраза, якая пры адзінстве тэмпу і метра развіваецца адносна аўтаномна.

Для ўзмацнення індывідуальнасці і непаўторнасці танцавальнага вобраза выкарыстоўваюцца інтанацыйныя ўпрыгожванні - мелізмы (грэч. melisma - песня, мелодыя). Да іх адносяцца фаршлаг, мардэнт, групэта, трэль. Усе гэтыя прыёмы ўносяць у лексіку танца элементы бясконцасці і бесперапыннасці, узмацняюць афарбаванасць і трапятанне пластычнага голасу, узбагачаюць яго новымі выразнымі адценнямі і паўтанамі. Аналізуючы выразныя магчымасці музычных афарбовак, неабходна адзначыць, што яны, будучы вытокам яркіх выяўленняў музычнай гармоніі ў танцы, значна ўзбагачаюць лексічны арсенал танцавальнага вобраза, ствараюць тую ігру фарбаў, таноў, адценняў, з якой у выніку складваецца шматколернасць музычна-пластычнага вобраза.

Лысянкова В.В.,
ст.выкладчык

## УДАСКАНАЛЕННЕ МЕТОДЫКІ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ НАВУЧЭНЦАЎ Ў ШКОЛЕ МАСТАЦТВАЎ

Дзіцячая школа мастацтваў - своеасаблівая пазашкольная ўстанова, якая выконвае функцыі прафесійнага і агульнаэстэтычнага выхавання. Гэты сінтэз ставіць перад настаўнікам шэраг спецыфічных праблем, патрабуе ўважліва вывучаць і беражліва захоўваць прафесійныя традыцыі, шырока выкарыстоўваць новыя прагрэсіўныя метады эстэтычнага выхавання дзяцей.

У эстэтычным выхаванні падрастаючага пакалення вялікую ролю адыгрывае харэаграфічная адукацыя, асновай якой з'яўляецца класічны танец. У адзначанай адукацыі вялікая роля належыць комплекснаму падыходу. Ен спалучаецца з дапаможнымі карэкцыйнымі практыкаваннямі на першым годзе навучання, што палягчае засваенне дзецьмі рухаў экзерсісу, паскарае фарміраванне балетнай паставы, развіццё вываратнасці ног.

Навучанне класічнаму танцу праходзіць ва ўзаемасувязі з музыкай. З першых крокаў музыка ўводзіць вучня у свет мелодыі, рытму і тэмпу. Падбор музычнага матэрыялу для суправаджэння ўрокаў класічнага танца павінен садзейнічаць правільнаму ўспрыманню музыкі і фарміраванню ўмення перадаваць яе змест праз пластыку і танец. Вучэбны музычна-харэагра-фічны матэрыял павінен быць даступным для ўспрымання. Адной з мэт навучання з'яўляецца фарміраванне эмацыянальных адносін да музыкі праз яе вобразную напоўненасць.

Праца над музычна-пластычным матэрыялам уяўляе сабой працэс, у якім падрабязны аналіз руху і эмацыянальна слыхавога ўспрымання накіраваны на адну мэту - удасканаленне выканання.

Настаўнік павінен праяўляць гібкасць у падыходзе да кожнай канкрэтнай групы навучэнцаў, творча вырашаць пытанні, якія ставіць перад ім вучэбны працэс. Пры гэтым галоўная мэта настаўніка - пошук метадаў працы, якія забяспечаць у складаных, спецыфічных умовах працы харэаграфічных аддзяленняў школ мастацтваў высокую якасць навучання, засваенне неабходных ведаў, уменняў і навыкаў.

Іх нельга проста «атрымаць», яны засвойваюцца і фарміруюцца ў выніку псіхічнай актыўнасці самога навучэнца. Навучэнец успрымае ўказанні настаўніка слыхам і вачыма, а адказвае рухамі цела. Перавод слыхавай і зрокавай інфармацыі на мову рухаў схаваны ад настаўніка. Аб тым, наколькі карэктна вучань зразумеў яго, настаўнік мяркуе па выкананні рухаў. І калі яны памылкова выкананы, настаўнік зноў тлумачыць, паказвае і патрабуе паўтарэння. Гэтыя частыя недакладныя паўторы, па-першае, займаюць шмат часу, па-другое, стамляюць галаўны мозг, цэнтральную нервовую сістэму. Вельмі часта вучні выдатна ведаюць усе правілы выканання практыкавання, усё растлумачаць і пакажуць, але выканаць патрэб-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ